■ Землякі

Герой з брыгады «Матэоці»

У партызанскім атрадзе на Апенінах адважна змагаўся клімаўчанін

Пасля заканчэння ў 1941 годзе васьмі класаў Аляксею Кісялёву споўнілася ўсяго чатырнаццаць гадоў. А ў сорак трэцім ён быў вывезены акупантамі са сваёй роднай вёсачкі Стары Стан Мілаславіцкага сельскага Савета, што на Клімаўшчыне, у Нямеччыну.

У родных мясцінах засталіся трое яго братоў-сірот. Бацькі, Кірыла Яўціхавіч і Аляксандра Іванаўна, памерлі пасля цяжкай хваробы, калі Алёшу было яшчэ ўсяго шэсць гадоў.

З дапамогай італьянскіх патрыётаў Кісялёў здзейсніў смелыя ўцёкі з лагера і стаў байцом Гарыбальдзійскай партызанскай брыгады «Матэоці». Удзельнічаў у васямнаццаці баявых аперацыях.

Амаль за два папярэднія гады знаходжання на акупаванай тэрыторыі ў Беларусі падлетак люта ўзненавідзеў фашыстаў, якія здзекамі, катаваннямі, расстрэламі, спальваннямі і вывазамі моладзі ў Германію наводзілі на шматпакутнай беларускай зямлі свой «новы парадак». Толькі ў адной яго вёсцы (калгас «Краіна Саветаў») за гады вайны было спалена 122 двары і тры жыхары-старастанцы, яшчэ 24 чалавекі забралі ў нямецкае рабства. А з франтоў Вялікай Айчыннай, як потым стане вядома, не вернуцца дахаты 64 воіны-землякі — хто загіне, а хто прападзе без вестак на той вайне.

Вось і стаў Лёша Кісялёў на барацьбу з ненавісным ворагам, узяўшы ў рукі зброю. Восенню 1944-га яго атрад выбіваў немцаў з мястэчка Кастэляўчэ.

НАША ДАВЕДКА. *Гарыбальдзійскія брыгады аб'ядноўвалі амаль палову італьянскіх партызанаў і дзейнічалі ў Італіі ў перыяд акупацыі краіны фашысцкай Германіяй у 1943 — 1945 гадах. З сярэдзіны 1944-га па сакавік 1945 года яны правялі каля 6,5 тысячы баявых аперацый і больш як 5,5 тысячы дыверсій. У радах італьянскіх партызанаў з фашыстамі змагаліся звыш 5 тысяч савецкіх грамадзян. Магілы савецкіх воінаў можна адшукаць амаль у 200 італьянскіх гарадах і пасёлках.*

Здаецца, пасля бою ўсё сцішылася, немцы адступілі. Клімаўчаніна разам з таварышам па зброі паставілі на пост на пад'язных шляхах. Раптам хлопцы заўважылі набліжэнне пяхоты праціўніка да ўзводу. Аляксей, нягледзячы на сваю маладосць, прыняў самастойнае рашэнне: не ўзнімаць раней часу трывогі, каб не спалохаць фашыстаў. А ўдвух, хоць сілы былі зусім не роўныя, даць адпор, адкрыўшы з блізкай адлегласці па гітлераўцах нечаканы агонь. Трапныя чэргі патрыётаў амаль што ва ўпор выклікалі вялікі пярэпалах у стане ворага, які падбіраўся скрытна, каб заспець антыфашыстаў нечакана. І немцы зноўку па-здрадніцку адступілі, пакінуўшы на дарозе восем трупаў.

Усяго толькі праз некалькі дзён, 2 кастрычніка 1944 года, у баях каля Капуньяна, што непадалёк ад горада Парэці, сямнаццацігадовы Аляксея Кісялёва, на жаль, загінуў. У знак удзячнасці ад італьянскага народа і ў памяць аб ім у Італіі на магіле ўдзельніка антыфашысцкага супраціўлення пастаўлены помнік. Ёсць пра яго радкі і ў раённай кнізе «Памяць», якія сведчаць пра тое, што подзвіг Аляксея Кавалёва не забыты і на радзіме. Засталося толькі адшукаць яго асабісты фотаздымак. Магчыма, дапамогуць у гэтым чытачы: герояў Айчыннай вайны трэба ведаць у твар.

Іван ЛАПО, краязнаўца,

г. Клімавічы

■

ЗАБЫТЫ ДЗОТ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

З дакладной камандавання брыгады імя Молатава начальніку БШПР: «...Палкі венграў, маючы перавагу ў жывой сіле і тэхніцы, дзвюма калонамі 21-га лютага падышлі да Дняпроўска-Бугскага канала ў раёне Беліна і Зарэчкі... За пераправу на канале завязаліся ўпартыя жорсткія баі. Шлях праціўніку заступаў канал і наша абарончая лінія, якая цягнулася ад стыку каналаў Белаазёрскага з Дняпроўска-Бугскім да Вулькі Кужалічанскай па паўднёвым беразе канала і была ўсеяная бліндажамі, дзотамі і бесперапыннымі хадамі зносін. Бой за пераправу на гэтых участках працягваўся трое сутак, і абяскроўлены праціўнік адкаціўся назад...»



Схема баёў атрада імя Калініна на канале 21-22 лютага 1944 года.

Страты

Жорсткі характар баёў пацвярджаюць і мадзьяры. Толькі колькасць забітых і параненых венгерскіх салдатаў моцна адрозніваецца ад звестак партызанаў. Але гэта звычайная практыка ў любой вайне, калі ў данясеннях прыніжаліся свае страты і намнога павялічваліся страты праціўніка.

Са справаздачы атрада імя Калініна: «...21-22 лютага 1944 года ў лютым баі, паводле звестак агентурнай разведкі, за два дні бою праціўнік страціў забітымі 270 чалавек. Колькасць параненых не ўстаноўлена, але вызначаецца лічбай каля 100 чалавек. У гэтым баі знішчана нямецкая процітанкавая гармата і станкавы кулямёт, захоплены 1 ручны кулямёт».

Яны памятаюць

У Драгічыне жыве Ніна Кузняцова, у мінулым разведчыца атрада імя Калініна. Яна памятае абарону канала і расказала наступнае: «...Падчас баёў на канале я была ў Малінаўцы (тады Калонія Белін. — **Аўт.**): там штаб знаходзіўся. Нашы партызаны прывезлі з-за лініі фронту зброю і патроны. Далі мне 2 тысячы патронаў у пачках і сказалі занесці камандзіру ўзвода Удодаву, які знаходзіўся на канале ў дзоце. Патроны несла пад абстрэламі. Тады мяне і параніла ў галаву: шрам ад асколка дагэтуль застаўся».

У падрабязнасцях памятае тыя падзеі і былы партызан разведузвода атрада імя Калініна, а цяпер прафесар, доктар медыцынскіх навук Іван Данілаў:

— Асноўныя баі адбываліся 22 лютага. Мадзьяры білі галоўным чынам з гармат, таму ў дзотах на бічаўніку вытрымаць было немагчыма. Увесь дзень яны нас атакавалі. Камісар Мілюшын паслаў мяне ў цэнтральны дзот да камандзіра атрада Самаркіна даведацца, ці можна паспрабаваць акружыць мадзьяр. Я папоўз уздоўж бічаўніка. Па месцы, якое вяло да дзота, біў снайпер. Неяк праскочыў. У дзоце Юрый Самаркін з партызанамі вялі бой. Я далажыў, што Мілюшын прапануе абысці і акружыць мадзьяр. Самаркін адказаў, што гэта немагчыма... Мінамёты мадзьярскія ўвесь час працавалі. Дзоты былі разбіты гарматамі. Пакінуўшы першую лінію абароны, у ноч на 23 лютага перайшлі на другую лінію. Самаркін застаўся жывы, але быў паранены ў руку. Забітых пакінулі ў разбураным дзоце.

Не пахаваныя?

Тое, што ў дзоце засталіся забітыя партызаны, пацвярджае і нямецкі дакумент, у якім паведамляецца: «...У бандыцкіх бункерах на поўдзень ад канала выяўлены разбіты ручны кулямёт і процітанкавая стрэльба, а таксама 6 чалавек забітых. Вялікая колькасць забітых і параненых забраны бандытамі ці згарэлі ў хатах. Уласныя страты: 1 забіты, 4 паранены».

У Нацыянальным архіве ў спісах загінулых у гэты перыяд партызанаў атрада імя Калініна значацца Васіль Юрасюк, Фёдар Вакульчык, Васіль Казека, Уладзімір Місавец, Лengвін Усцінаў. У іншым дакуменце таксама ўказаны Сцяпан Кахоўскі, які, хутчэй за ўсё, загінуў на мастку праз канал. Што тычыцца пахавання воінаў, у партызанскіх дакументах ёсць недакладнасці. У адным з іх у графе «месца пахаванняў» пазначана: «на могілках атрада імя Калініна», у іншым — «трупы не вынесены з поля бою».

Дырэктар драгічынскага Ваенна-гістарычнага музея імя Удовікава Сяргей Гранік, які даўно займаецца пошукам месцаў пахавання часоў вайны, лічыць, што ўсе палеглыя тады партызаны не былі пахаваны. «Рэальна гэта зрабіць было немагчыма, бо першую лінію абароны захапілі немцы, — расказвае ён. — Партызаны не хацелі казаць, што не вынеслі таварышаў з поля бою, а ў справаздачы напісалі, што пахавалі. Час быў такі. А больш пахаваць не было каму: немцы былі тут аж да вызвалення раёна ў ліпені 1944 года».

Тое, што забітых каля канала ніхто не хаваў, пацвярджае і сведка тых падзей, жыхар Беліна Міхаіл Бычык:

— Мадзьяры два бункеры каля парома разбілі, толькі трэскі ляцелі. З двух бункераў партызаны сышлі, а ў трэцім, які быў насупраць Белянка, яшчэ сядзелі. Мадзьяры падцягнулі туды гармату і пачалі страляць па дзоце. Пасля паслалі нашых мужыкоў да дзота: там трупы партызанаў ляжалі. Выцягнулі іх усіх да канала, а нас прывялі на іх глядзець і апазнаваць. Перакладчыкі-славакі пыталі: «Вы пазнаяце гэтых людзей? Яны прыходзілі да вас? Вы іх ведаеце, але не хочаце гаварыць!» Мы адказвалі, што яны нам незнаёмыя. Потым мадзьяры ўсіх забітых пакінулі каля канала.

У той жа час за каналам, недалёка ад хутара мясцовай жыхаркі Праскоўі Ваньковай, знаходзіцца месца ў выглядзе кургана, знешне падобнае на пахаванне. Гаспадыня хутара сцвярджае, што, па ўспамінах яе маці, там якраз і пахаваны забітыя партызаны.

Вымушаны адступаць...

У канцы сакавіка на станцыях Драгічын і Янова (цяпер гэта горад Іванава) для падмацавання венграў была выгружана нямецкая дывізія. Рыхтавалася новае наступленне на партызанскую зону. Брыгада імя Молатава ўстойліва трымала абарону. Баі працягваліся да канца сакавіка, і партызаны, адчуваючы недахоп боепрыпасаў, вымушаны былі адыходзіць ва Украіну.

У баях на канале ў адным з дзотаў загінулі партызаны з аддзялення Паўла Сенчука, якія мелі баявы вопыт і былі загартаваныя ў дыверсійнай вайне на чыгунцы. Сянчук пасля тых баёў застаўся жывы і за падрывы эшалонаў на чыгунцы і баі на канале быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Абаронцаў дзота, якія засталіся там назаўсёды, не адзначылі нават пасмяротна. Аб геройскім баі народных мсціўцаў нішто не нагадвае, нават сціплы помнік. Цяпер каля старога моста, дзе стаяў цэнтральны дзот, працуе паромная пераправа, а па берагах канала выраслі дрэвы і хмызнякі.

Аляксандр ПАЎЛЮКОВІЧ,

г. Мінск.

МАЙСТРЫ ДАРОЖНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

— І ў мірны час транспартныя войскі выконваюць вялікую работу па будаўніцтве і аднаўленні аўтамабільных дарог і мастоў, абароне дарожных аб'ектаў і нават ліквідацыі наступстваў надзвычайных сітуацый...

— Наша задача — рыхтавацца не толькі да вайны, а і забяспечваць транспартную бяспеку ў мірны час. Транспартныя войскі ўдзельнічаюць у ліквідацыі наступстваў як тэхнагенных, так і катастроф прыроднага характару. Хто, як не мы, першымі ўключыліся ў працу па ачыстцы дарог ад снегу, які ў 2013 годзе прынёс цыклон «Хаўер», а нядаўна «Даніэла» і «Эма»? У памяці — размыў дарожнага палатна ў Віцебску, якое праходзіла ўздоўж воднай перашкоды. Пайсці пад адхон цягніку не дазволілі нашы вайскоўцы, якія ў кароткі тэрмін накіраваліся да месца здарэння. Транспартныя войскі прыйшлі на дапамогу і тады, калі пры будаўніцтве аўтадарожнага моста праз Заходнюю Дзвіну ў раку ўпала 900 тон металу, якія перакрылі суднаходны рух па воднай магістралі. Аднавілі яго воіны-транспартнікі.

— Часам праца воінаў-дарожнікаў застаецца, што называецца, за кадрам. А між іншым, дзякуючы ім ваенная тэхніка і ўзбраенне своечасова трапляюць на палігоны, на якіх плануюцца адбыцца вучэнні. Летась мінамётныя залпы і кулямётныя чэргі грымелі ў розных месцах краіны і за яе межамі. Ці вытрымалі ваеннаслужачыя транспартных войскаў экзамен на прафпрыдатнасць?

— Мерапрыемствы па перакідванні войскаў на шматлікія адлегласці, у тым ліку на палігоны, якія летась былі задзейнічаны не толькі ў межах Саюзнай дзяржавы, а і ў межах АДКБ, паспяхова рэалізаваны. Сумесна з Міністэрствам транспарту і камунікацый, Беларускай чыгункай і «Белавіяй» мы заўсёды выбіраем найбольш эфектыўныя і эканамічныя спосабы перамяшчэння ўзбраення і тэхнікі. Безумоўна, удзельнічаючы ў падобных мерапрыемствах у мірны час, мы рыхтуем сябе да таго, каб у цяжкую хвіліну выканаць задачы ў любых абставінах. Але вельмі складана навучыць маставіка на палігоне. Таму спецыялісты-маставікі рыхтуюцца на рэальных аб'ектах транспартнай інфраструктуры рэспублікі, разам з тым удзельнічаючы ў дзяржаўных праграмах.

— Адна з іх — «Дарогі Беларусі». Што яшчэ за апошні час зроблена дэпартаментам у праектах, звязаных з рэальным сектарам эканомікі?

— У межах рэалізацыі дзяржаўнай праграмы «Дарогі Беларусі» ваеннаслужачымі транспартных войскаў на працягу апошніх гадоў наведзены аўтадарожныя масты агульнай працягласцю больш за тры кіламетры і семсот метраў, узведзена больш за 50 штучных збудаванняў. Пры рэканструкцыі аўтамагістралі Мінск — Гомель дзякуючы часоваму аўтадарожнаму мосту, наведзенаму праз раку Свіслач, быў істотна скарочаны час на будаўніцтва капітальнага моста, зніжаны выдаткі на яго ўзвядзенне. Пры правядзенні капітальнага рамонту аўтадарожнага моста праз Дняпро ў Шклове штатная маёмасць транспартных войскаў дазволіла пазбегнуць лішніх выдаткаў і было сэканомлена больш як 12 мільярдаў рублёў. Акрамя таго, ваеннаслужачыя ўдзельнічаюць у праграме «Развіццё і ўдасканаленне дарог Беларусі», выконваюць задачы па інжынерным абсталяванні дзяржаўнай мяжы. Нашу маёмасць мы выкарыстоўваем і пры рэалізацыі дзяржаўнай праграмы будаўніцтва гідраэлектрастанцый. Праз краіну праходзяць шматлікія транспартныя калідоры. І наша задача — стварыць бяспечныя ўмовы для праходжання грузаў, увогуле засцерагчы ад небяспекі ўсю транспартную інфраструктуру краіны.

— Ці здольная тэхніка, якая стаіць на ўзбраенні транспартных войскаў, вырашаць усе надзённыя задачы? Як часта абнаўляецца аўтамабільны парк?

— Транспартныя войскі валодаюць унікальнымі матэрыяльнымі сродкамі, якія дазваляюць у кароткі тэрмін аднавіць рух транспарту, маецца сур'ёзны патэнцыял тэхнікі. Ужо абноўлена каля 30% узбраення і тэхнікі. Што тычыцца аўтамабіляў, самазвальны і грузавы паркі абноўлены амаль цалкам, прычым тэхнікай айчыннай вытворчасці. Але каб гарантавана забяспечыць транспартную бяспеку, мы павінны мець на ўзбраенні не толькі магутныя машыны, а і тыя спецыяльныя сродкі, якія за непрацяглы час дазваляюць выканаць комплекс мерапрыемстваў па аднаўленні руху транспарту. Тут абнаўленне адбылося на 20%. Праходзіць мадэрнізацыю маставая маёмасць.

Хачу адзначыць унікальнасць тэхнікі вытворчасці Мінскага аўтамабільнага завода. Такія камбінаваныя сродкі, як лакамабілі, здольныя рухацца як па аўтадарогах, так і па рэйках, заехаўшы на іх з любога ўчастка і працягваючы рух па чыгунцы. Гэтыя машыны з дапамогай усяго аднаго спецыяліста здольныя выканаць цэлы комплекс мерапрыемстваў, у тым ліку па бездарожжы. Напрыклад, 20-тонныя самазвалы апраўдалі сябе падчас працы на спартыўных аб'ектах: летась ваеннаслужачыя ўдзельнічалі ў рэканструкцыі лыжаролернага комплексу «Заечая паляна», дзе рыхтуюцца нашы біятланісты. Такім чынам, тэхніка, якая стаіць на ўзбраенні транспартных войскаў, можа эфектыўна забяспечыць выкананне шмат якіх задач.

«Удзельнічаючы ў падобных мерапрыемствах у мірны час, мы рыхтуем сябе да таго, каб у цяжкую хвіліну выканаць задачы ў любых абставінах».

— А дзе можна атрымаць дыплом воіна транспартных войскаў? І якім чынам трапіць да вас прызыўніку?

— Спецыялістаў-прафесіяналаў рыхтуюць у Ваеннай акадэміі, на ваенна-транспартным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту. Акрамя таго, адпаведную адукацыю можна атрымаць і ў Санкт-Пецярбургу: у Ваенным інстытуце чыгуначных войскаў і ваенных зносін, Ваеннай акадэміі матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. Падрыхтоўку малодшых спецыялістаў мы ажыццяўляем у Слуцку, дзе створана добрая вучэбна-матэрыяльная база.

Для таго, каб трапіць у транспартныя войскі, па-першае, прызыўнік павінен хацець служыць. Па-другое, быць мужным, фізічна падрыхтаваным. Вітаецца наяўнасць тэхнічнай адукацыі па спецыяльнасці. Калі ж яе няма, то ён абавязкова атрымае спецыяльнасць у войску. Вы ўяўляеце, колькі падрыхтавана прафесіяналаў для транспартнай галіны толькі пры ўдзеле ваеннаслужачых у праграме «Дарогі Беларусі»?! Пасля звальнення з Узброеных Сіл такі салдат ніколі не застанецца без працы, бо будзе валодаць надзейнай спецыяльнасцю, якая карыстаецца попытам у грамадзянскім жыцці. Адсюль — і вялікае жаданне служыць у нас.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

■ Гісторыя маёй сям'і

«БЫЦЦАМ ФІЛЬМ ПРА ВАЙНУ ПАГЛЯДЗЕЛІ...»

У той дзень у Рыбцах загінулі 143 чалавекі

Цёплы майскі дзень 1965 года. Дзень Перамогі!
Мой бацька, Рыгор Іванавіч Молчан, яшчэ зранку надзеў святочную кашулю, прымацаваў да яе ордэн Айчыннай вайны, ордэн Славы, медаль «За перамогу над Германіяй»...
І паехаў разам з іншымі ветэранамі ў цэнтр калгаса «Барацьба» — вёску Зазерка — на мітынг.
Маці гатавала абед.
А мы з любімай бабуляй выйшлі ў двор і селі на лавачцы.

На вачах Марыны Вальковіч гітлераўцы забілі ўнукаў і цяжарную дачку.

Да вялікага помніка, што стаіць каля школы, падышла група моладзі. Дзяўчаты і хлопцы разглядзелі фігуру партызана, высечаную з каменю, і абеліскі па баках з дзясяткамі імёнаў, многія з якіх паўтараюцца, — на вайну ішлі сем'ямі. Пастаяўшы крыху і ўсклаўшы кветкі, студэнты перайшлі вуліцу і, апынуўшыся ў нашым двары, папрасіліся адпачыць з дарогі і наталіць смагу. Бабуля Марына, невысокая, у белай хустачцы, са зморшчаным тварам і добрымі вачыма, падышла да калодзежа і стала набіраць ваду. Я вынесла з хаты кубачкі. Па чарзе ўсе напіліся сцюдзёнай вадзіцы, а потым папрасілі гаспадыню, Марыну Васільеўну Вальковіч, расказаць пра помнік.

— Ой, цяжка мне гэта ўспамінаць, — казала яна. — Але трэба, каб вы, маладзенькія, ведалі праўду і бераглі ў памяці ды сваім дзеткам потым расказвалі. Не дай Бог такому паўтарыцца!

Студэнты расселіся на лаўцы, на траве, на бервяне і быццам фільм пра вайну паглядзелі — так цікава апавядала бабуля Марына, часам выціраючы старэчыя слёзы рагамі сваёй хустачкі... А я, тады 13-гадовая школьніца, ужо каторы раз зноў выслухала знаёмую да болю гісторыі маёй сям'і.

Вось што расказвала бабуля:

«Праз вёску нашу праходзіць чыгунка, і партызаны, што пачалі дзейнічаць у вайну ў мясцовых лясах, часта выкарыстоўвалі зручныя падыходы да яе, каб падрываць нямецкія эшалоны. Тое ж было і ў суседніх вёсках. Не дзіва, што ўсе населеныя пункты каля чыгункі фашысты лічылі партызанскімі. Зімой 1942—1943 гг. немцы асабліва лютавалі. Паўсюдна праводзілі карныя аперацыі: палілі вёскі, забівалі жыхароў. А дапамагалі ім здраднікі-паліцаі. Нехта з іх у вёсцы Зазерка зрабіў для немцаў спіс усіх партызанскіх сем'яў. І вось у лютым 1943 года былі спалены толькі хаты тых людзей, з чыіх сем'яў хоць хто-небудзь быў у партызанах. І народу шмат забілі. Дайшлі чуткі, што неўзабаве тое ж будзе і з нашай вёскай.

«У двор зайшоў фашыст, даў чаргу з аўтамата па вокнах, убачыўшы там дзіцячыя тварыкі. Умомант усе дзеці пасыпаліся на падлогу».

У мяне сямёра сыноў і дачок было тады. Іван, Валодзя і Ульяна пайшлі ў партызаны разам з бацькам. Волька, замужняя, мела ўжо траіх дзяцей, жыла за сем кіламетраў у Варонічах. Да яе і адправіла ў той жудасны дзень сваіх меншанькіх дзяўчат-падлеткаў Ніну і Яўгенню. Ледзь паспелі яны дабегчы да лесу, як Рыбцы ўжо былі акружаны карнікамі. Ганна, самая старэйшая, жыла з мужам Сцяпанам Драздом і чацвярымі дзеткамі асобна, у сваёй хаце ў Рыбцах. Вось-вось павінна было з'явіцца на свет іх пятае дзіцятка. Дык мы напярэдадні падрыхтаваліся да карнай аперацыі: перанеслі пажыткі ў хату Ганны, а яшчэ свінчо да яе ў хлеў загналі. Рахманая такая свінка была, ручная, нікога не баялася. Сцяпан разам з іншымі мужчынамі зранку паехаў жыта змалоць у суседнюю вёску. Лілечка, старэйшая мая ўнучачка, так прасілася: «Татачка, вазьмі мяне з сабой!» А ён вырашыў, што спакайней будзе дачцэ з маці, і пакінуў яе дома.

Ну, а я пайшла да Ганны: раптам роды пачнуцца? Многія жыхары вёскі зрабілі тады так, як і мы: хто ў іншыя вёскі да радні пайшоў, хто да сваіх у Рыбцы разам са скарбам ды жывёлай перабраўся — усе думалі, што спаляць канкрэтныя хаты. Але здарылася ўсё не так. Карнікі дакладна не ведалі партызанскіх сем'яў у вёсцы. Яны забралі Якава, пажылога чалавека, і пад дулам аўтамата загадалі паказаць усе патрэбныя ім хаты. Той не пагадзіўся, за што яго і расстралялі. Разазлаваны няўдачай нямецкі афіцэр аддаў загад паліць усю вёску. Тут і пачалося самае жахлівае. Карнікі з факеламі падпальвалі хаты, стралялі па ўсіх, хто трапляў на вочы.

Помнік загінулым жыхарам вёскі Рыбцы. На абелісках — больш за сотню імёнаў.

Ганна прасіла дзяцей схавацца, а малым жа цікава было, што на вуліцы робіцца. Паселі яны на лаўках перад вокнамі: Ліля с Галяй у адным акне, Геня і Колечка — у другім. Я ля печы завіхалася, ваду грэла. Раптам пачалася страляніна. У двор зайшоў фашыст, даў чаргу з аўтамата па вокнах, убачыўшы там дзіцячыя тварыкі. Умомант усе дзеці пасыпаліся на падлогу. Не паспела я зразумець, ці ўнукі параненыя, ці адразу загінулі, бо ў хату зайшоў паліцай, і мы з Ганнай кінуліся хавацца за печ (а яна так была зроблена, што ўкругавую можна было каля яе прайсці). Ды не паспела дачушка мая, дагнала яе куля. Прама ў жывот трапіў вырадак гэты, потым яшчэ раз выстраліў. А я выскачыла з другога боку печы — ды на двор. Хата ўжо гарыць, хлеў адчынены, свінка бегае, вішчыць. Вельмі мне страшна стала. Узяла я ды кінулася на зямлю. Думаю: хай забівае так. Падбегла да мяне свінка, круціцца вакол, а немец, што падпальваў хату, страляе ў мяне. Прашыў парасё наскрозь, а я ляжу, не зварухнуся нават. Горача зрабілася, бо ўсё вакол гарыць, хата палае. Немец пайшоў далей, я крыху адпаўзла да вішань, з'ела прыгаршню снегу. Самае жуданае было ў тым, што нічым не магла ўжо дапамагчы сваім родненькім. Хоць, можа, яшчэ і жывыя яны гарэлі... Хаты ж тады былі драўляныя, а стрэхі — з саломы. Згаралі імгненна.

Вечарам і на наступную раніцу збіраліся ў Рыбцах на пажарышчах тыя, хто ўцалеў. Людзі знаходзілі костачкі згарэлых родных, збіралі іх і везлі хаваць на могілкі. У той дзень у вёсцы загінулі 143 чалавекі. Іх прозвішчы і пералічаны на абелісках каля школы...»

Бабуля Марына згорбілася — здавалася, яшчэ больш пастарэла ад цяжкіх успамінаў, — але зноў загаварыла:

«Вельмі ж гараваў тады мой зяць, як вярнуўся з млына, ледзь валасы на сабе не рваў ад таго, што не забраў з сабою старэйшую дачушку: хоць бы яна жывая засталася. Стаў і ён партызаніць, а ў 1944-м, як вызвалялі гэтыя мясціны, пайшоў на фронт. Некалькі лістоў ад яго атрымалі, і ва ўсіх самымі галоўнымі словамі былі вось гэтыя: «Усе мае таварышы гінуць, а мяне кулі не бяруць. Помшчу за сям'ю». І ўсё ж пад Берлінам у 1945 годзе загінуў і сам. На фронце прапаў без звестак і яшчэ адзін мой зяць, муж Вольгі Іван Сарока. Толькі нядаўна даведаліся яго дзеці, унукі мае, што пахаваны ён у Польшчы ў брацкай магіле. Слава Богу, усе астатнія мае дзеткі засталіся жывымі...»

«Вечарам і на наступную раніцу збіраліся ў Рыбцах на пажарышчах тыя, хто ўцалеў. Людзі знаходзілі костачкі згарэлых родных, збіралі іх і везлі хаваць на могілкі».

Дзяўчаты і хлопцы сядзяць як скамянелыя. Ніхто не адважваецца зноў загаварыць. І гэта толькі адзін эпізод трагедыі спаленай у лютым 1943 года вёскі Рыбцы Рудзенскага раёна (цяпер Пухавіцкага).

Ужо даўно няма маёй бабулі, маіх бацькоў, няма цётак і дзядзькоў... Але і сёння помніцца, як кожны з іх са слязьмі на вачах расказваў пра той жудасны час. Цяпер расказваю я, ужо сваім унукам, каб, як казала бабуля Марына, «не дай Бог такому паўтарыцца!..»

Ірына КАРТАШОВА,

г. Заслаўе

■